## Голас вясны

Як быў я малы, тата часта ў канцы зімы казаў:

— Пойдзем, сынок, на двор, пакажу табе вясновыя слёзкі.

— Адкуль тыя слёзкі возьмуцца? — дзівіўся я. — Мароз на шыбах вунь якія ўзоры размаляваў!

— І ўсё адно вясна ўжо радаснымі слёзкамі ўмываецца. Зірні сюды.

Мы станавіліся пад застрэшак, дзе ўгравала сонца. З вострых ледзяшоў, што звісалі са стрэх, адна за другой зрываліся празрыстыя кроплі. Яны выбівалі ў снезе круглыя роўныя ямкі.

«Кап-бульк! Кап-бульк!» — усміхалася радасна вясна. І жэўжыкі-вераб'і навыперадкі стараліся пакупацца ў першай вясновай вадзе. Натапырвалі пер'е, яршыліся, аж пырскі разляталіся ад заядлых купальшчыкаў.

А мы з бацькам ішлі далей за хату, дзе пачынаўся лес, і на прыгорку, каля высокіх сосен, знаходзілі першыя жоўценькія кветачкі.

— Бач, падбелы з'явіліся. Вось яны — першыя кветкі вясны, — тлумачыў мне бацька. — Дзе зацішна і сонечна, там і шукай іх.

На парыжэлым падталым снезе поўзалі нейкія чырвоныя жучкі і даўганосыя камарыкі. Бацька казаў, што ўсе яны пачулі голас вясны.

— Прыслухайся добра. Ты таксама той голас пачуеш, — гаварыў бацька.

І я прыслухоўваўся.

Ціха шумелі сосны. Са зламанай галінкі бярозы адна за другой сцякалі на зямлю светлыя чысцюткія кропелькі. Стукаў у кару дрэва дзяцел. Не так, як зімой, а часцей: пэўна ж, прагаладаўся за зіму небарака. Упершыню пасля зімы спявалі сініцы. І нават у поўдзень у мурашніку яшчэ напаўсонныя мурашкі пачыналі варушыць вусікамі. Быццам абнюхвалі халаднаватае, але з адметнымі вясновымі пахамі паветра...

І цяпер, як трохі вышэй пачне хадзіць сонца, а прамяні яго стануць цяплейшымі, я, як некалі мне бацька, кажу свайму Сашу:

— Апранайся, сын. Пойдзем слухаць голас вясны.

М. Даніленка

III ________________________________

1. Пра якія вясновыя слёзкі гаварыў тата ў тэксце?
   ☐ *дождж* ☐ *кропелькі* ☐ *ручайкі*

2. Падкрэслі аднакаранёвае слова да слова ***застрэшак***.
   *страх страха стрэльба страшэнны*

3. Падкрэслі назвы жывёл, пра якія расказваецца ў тэксце.
   *Сініцы, дзяцел, сарока, мурашкі, вераб'і, камарыкі, чырвоныя жучкі, снегіры, божыя кароўкі.*

4. Падпішы малюнак першацвета, пра які гаворыцца ў тэксце.





_______________ _______________ _______________

5. Закрэслі лішняе слова ў сказе.
   *Увесь тэкст прасякнуты радасным/сумным настроем.*
   Падкрэслі словы і выразы ў тэксце, якія перадаюць гэты настрой.

6. Абапіраючыся на тэкст, дапоўні табліцу.

| НАДЫХОД ВЯСНЫ | |
|---|---|
| **Жывая прырода** | **Нежывая прырода** |
| Вераб'і стараліся пакупацца ў першай вясновай вадзе | З вострых ледзяшоў зрываліся празрыстыя кроплі |
| | |
| | |
| | |